Людзі сталага ўзросту ў пост спявалі духоўныя вершы.

*Літ.*: Карский Е.Ф. Белорусы. М., 1916. Т. 3, ч. 1. С. 97—137; Беларуская народная вусна-паэтычная творчасць: Гісторыка-тэарэт. дaслед. Мн., 1967. С. 61—77; Зімовыя песні: Калядкі і шчадроўкі / Склад. Гурскі А.І., Мажэйка З.Я. Мн., 1975; Ліс А.С., Асташэвіч С.Т. Купальскія і пятроўскія песні. Мн., 1985.

*А. І. Гурскі.*

**ПО́ЎДЗЕНЬ**. У вусна-паэтычнай спадчыне і міфалогіі беларусаў П. не ўспрымаўся як самадастатковая адзінка вымярэння часу, а цалкам суадносіўся (як бінарная апазіцыя) са сваёй супрацьлегласцю — *поўначчу*. П. супастаўлялі з поўняй (фазай Месяца), якая, як вядома, адмоўна ўплывае на стан здароўя чалавека. Рытуальна-абрадавыя кантэксты сведчаць пра тое, што П. быў своеасаблівым паваротным пунктам у выкананні абрадаў пераходнага тыпу. У асобных мясцінах у гэты час адпраўляліся зажынаць; калі першы гром прагрыміць у П., чакалі спякотнага лета. Абрадавая абмежаванасць гэтага часу тлумачыцца тым, што ў П. з хаты выносілі нябожчыка. Уся праца спынялася, бо кожны павінен быў правесці памерлага ў апошні зямны шлях.

*Літ.*: Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 1. Зямля стаіць пасярод свету... Мн., 1996; Крук Я. Сімволіка беларускай народнай культуры. Мн., 2001; Крук Я., Котович О. Колесо времени: традиции и современность. Мн., 2003. С. 120—121.

*А. В. Катовіч.*

**ПО́ЎНАЕ І ПУСТО́Е**, паняцці, якія знаходзяцца між сабою ў бінарнай апазіцыі і ў нар. уяўленнях маюць сімвалічны сэнс. Поўнае заўсёды асацыіравалася з багаццем, дастаткам, пустое — з беднасцю, галечай. Таму добрым знакам лічылася сустрэць у дарозе поўны воз дроў, чалавека з поўным абярэмкам сена. Асабліва вялікую ўдачу абяцала, калі хтосьці пераходзіў дарогу з поўным вядром вады. І наадварот, калі дарогаю сустрэнецца, ці тым больш пяройдзе яе чалавек з пустым вядром, верылі, што абавязкова не пашанцуе: у рыбака будуць пустыя сеткі; таму, хто едзе на ворыва ці з ворыва або на засеўкі, не пашчасціць з ураджаем (на полі будзе шмат пустых мясцін, прагалаў і інш.). Абавязкова не пустым вярталі чужы посуд, каб таму, у каго яго пазычалі, не было пуста: у збанок клалі хоць лусту хлеба, тады ў каровы не перавядзецца малако. Паняцці П. і п. нярэдка ўзнікалі і падчас сямейных абрадаў. Сустрэча кумоў, што вязуць хрысціць дзіця, з чалавекам, які нясе поўнае ці пустое вядро, абяцала нованароджанаму або шчаслівае жыццё, або блізкую смерць. На передвясельным этапе— *запоінах*, калі адчувалася папярэдняя згода на шлюб, будучая нявеста вяртала сватам прывезеную імі і выпітую бутэльку не пустую, а ссыпала ў яе зярняты жыта, тым самым як бы жадаючы будучай радні дабрабыту. Перад выездам на шлюб поўнае вядро вады як сімвал плоднасці вылівалі каню пад ногі, а сустракалі з-пад вянца маладых таксама з поўнымі вёдрамі і з пажаданнямі, каб іх жыццё поўнілася шчасцем. Зробленая загадзя труна не павінна была ніколі заставацца пустою, каб не прыцягнуць да сябе дачасна нябожчыка, і таму яе ў такіх выпадках засыпалі жытам. Часта ў народзе паняцце поўнага (г. зн. багацця) звязвалася з адпаведнай квадраю Месяца — поўняю. Асабліва гэта датычылася розных пачынанняў (магія 1-га дня): менавіта на поўню стараліся запасваць скаціну (каб яна добра пладзілася), рабіць провідкі перад ворывам (тады і засекі будуць поўныя). Пустым днём, калі непажадана пачынаць справу (напрыклад, выходзіць на сяўбу), лічыўся панядзелак. І наадварот, худы, тоненькі сярпок месяца нібыта варожыць на беднасць. На П. і п. арыентаваліся дзяўчаты падчас каляднай варажбы, выцягваючы саламіны з новай страхі: калі трапляўся поўны колас — выйдзе замуж за багатага, калі пусты — за беднага. Тая ж сімволіка прысутнічала і пры тлумачэнні сноў: поўная пасудзіна, поўны воз прадказвалі радасць, даход, багацце, а пустая — смутак, убытак, беднасць. Пусты куфар у сне сведчыў пра набліжэнне чыесьці смерці ў доме.

*Літ.*: Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 1. Зямля стаіць пасярод свету... Мн., 1996. С. 245, 248—249, 251, 256, 262, 443, 505—506, 509, 511; Тое ж. Кн. 2. Жыцця адвечны лад. Мн., 1998. С. 121, 123, 194, 215, 269, 431, 508; Тое ж. Кн. 3. Зямная дарога ў вырай. Мн., 1999. С. 645.

*У. А. Васілевіч.*

**ПО́ЎНАЧ**. Характарызуецца супярэчлівасцю і самай значнай колькасцю рознахарактарных абрадавых дзеянняў. З

РЕПОЗИТОРИЙ БГУ КИ